турным развіцці пад уплывам рэформ другой паловы XIX – пачатку XX ст., якія актывізавалі мадэрнізацыйныя працэсы ва ўсіх сферах, аб чым расказана В. Я. Насевічам на прыкладзе роднай вёскі і воласці, і да кардынальнай перамены кірунку ўсіх бакоў эканамічнага і сацыякультурнага развіцця пасля рэвалюцыйных узрушэнняў 1917 г.

А. І. СМОЛІК

## ЯЎСТАФІЙ ТЫШКЕВІЧ У КААРДЫНАТАХ СВАЙГО ЧАСУ

Навуковая думка Беларусі ў XIX ст. складвалася пад уплывам разнастайных эканамічных, сацыяльна-палітычных, культурных і ідэйных фактараў. Навуковыя адкрыцці ў галіне фізікі, хіміі, біялогіі, астраноміі, геалогіі, медыцыны адбываліся адно за адным. Прыродазнаўчы прагрэс паўплываў і на гуманітарныя навукі, шэраг з якіх пераходзяць на пазіцыі біялагічнага рэдукцыянізму. Гэта закранула асобныя кірункі этналогіі, псіхалогіі, сацыялогіі і, безумоўна, узнікшай у канцы стагоддзя навукі аб культуры (культуралогіі, культурнай антрапалогіі). Станоўчы ўплыў на фарміраванне свядомасці інтэлігенцыі аказваў і вызваленчы рух, які разгарнуўся ў 1820–1840-я гг. У гарадах нашай краіны было створана некалькі тайных таварыстваў, якія ставілі сваёй мэтай падрыхтоўку ўзброенага паўстання супраць расійскага царызму, выступалі з патрабаваннем сацыяльных і палітычных перамен.

Рост нацыянальнай свядомасці народа, актывізацыя барацьбы за вызваленне і выхад на арэну гістарычнай творчасці садзейнічаў развіццю беларускай нацыянальнай культуры. У літаратуру, выяўленчае мастацтва, навуку прыйшла бліскучая плеяда творцаў, якія стаялі на пазіцыях рамантызму, у якім спалучаліся рысы дваранскага асветніцтва, дыдактызму і сентыменталізму. Прадстаўнікі беларускага рамантызму арыентаваліся на духоўныя каштоўнасці народа. Вялікую ролю ў развіцці грамадскай думкі адыгралі вучоныя і выкладчыкі Віленскага ўніверсітэта, Горы-Горацкага земляробчага інстытута.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У навучальных установах распаўсюджвалася забароненая літаратура, ствараліся тайныя гурткі. Значная колькасць выкладчыкаў прытрымлівалася вольналюбівых ідэй і абуджала свядомасць студэнтаў.

У 40–50-ыя гг. пачынаецца кансалідацыя беларускай нацыі, на грамадскую арэну выходзіць шэраг вядомых дзеячаў беларускай культуры. Іх дзейнасць становіцца больш свядомай і мэтанакіраванай. Эпоха шырокага дэмакратычнага руху, этнакультурнай кансалідацыі беларускага народа выклікала на мастацкую арэну выдатную плеяду паэтаў-дэмакратаў. Пачынальнікамі новай беларускай літаратуры былі П. Багрым, Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч, В. Дунін-Марцінкевіч, К. Каганец і інш.

У 2-й палове XIX ст. у новай беларускай літаратуры ўзнікае рэалістычны кірунак. Ф. Багушэвіч, Я. Лучына і іншыя былі прапаведнікамі ідэалогіі сялянскага дэмакратызму.

Выспяванне нацыянальнай самасвядомасці пабудзіла прадстаўнікоў розных грамадска-палітычных кірункаў да ўсебаковага вывучэння эканомікі, гісторыі, мовы, культуры Беларусі і асобных яе рэгіёнаў. Багатым дакументальным матэрыялам гэтага часу вызначаюцца працы М. В. Без-Карніловіча («Гістарычныя звесткі пра выдатныя мясціны на Беларусі з дадаткам іншых звестак, якія да яе ж адносяцца»), Т. Нарбута («Гісторыя беларускага народа»). Матэрыяльную і духоўную культуру асобных рэгіёнаў Беларусі вывучалі К. А. Гаворскі, З. Я. Даленга-Хадакоўскі, Р. А. Падбярэзскі, Э. Ф. Плятар, А. Ф. Рыпінскі, А. П. Сапуноў і інш.

У 2-й палове XIX ст. актывізуецца дзейнасць расійскіх і польскіх даследчыкаў па вывучэнні гісторыі, мовы, фальклору беларускага народа. Прадстаўнікі расійскай афіцыйнай навукі з пазіцый канцэпцыі заходнерусізму імкнуліся адшукаць агульнасць рускай і беларускай культур, а польскія – даказаць еднасць беларусаў і палякаў. Але менавіта вынікі рускай і польскай навукі, незалежна ад палітычнай арыентацыі даследчыкаў, пацвердзілі нацыянальную самабытнасць беларусаў, абудзілі ў беларускай інтэлігенцыі цікавасць да сваіх каранёў. Пачынаецца свядомае самапазнанне беларускага этнасу і яго культуры. У гэты перыяд П. Баброўскі, А. Багдановіч, Н. Васільева, У. Вярыга, Л. Галамбёўскі, І. Грыгаровіч, З. Да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ленга-Хадакоўскі, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, А. Кіркор, Ю. Крачкоўскі, І. Насовіч, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, А. Сапуноў публікуюць шэраг грунтоўных прац, у якіх сабраны разнастайныя артэфакты духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Шматграннасцю і фундаментальнасцю вызначаліся працы братоў К. П. Тышкевіча (1806–1868) і Я. П. Тышкевіча (1814–1873), якія зрабілі важны ўнёсак у станаўленне айчыннай навуковай археалогіі, музеязнаўства, фалькларыстыкі і этнаграфіі. Грунтоўную па тым часе адукацыю браты атрымалі ў езуіцкіх і дамініканскіх калегіумах, Мінскай гімназіі, Віленскім універсітэце. Адукацыя Яўстафія, на думку Вінцэся Каратынскага, які прысвяціў жыццю і творчасці Яўстафія свой нарыс, было «элеганцкім, вытанчаным, усяведным, але не глыбокім» [1, с. 127]. Гэта адчуваў і сам малады граф. Таму ён адпраўляецца ў Пецярбург, дзе самастойна тры гады папаўняе веды ў бібліятэках.

Лагойск са старажытным замкам, раскіданыя навокал замчышчы, гарадзішчы і курганы з дахрысціянскай мінуўшчыны выклікалі вялікую цікавасць Яўстафія і яго брата Канстанціна. Вельмі эмацыянальна апісаў краявіды Барысаўшчыны Вінцэсь Каратынскі ў сваім нарысе. «Густая сетка балот, пісаў ён, якія шырока цягнуцца па берагах Дзвіны і Дняпра, мноства рэк і рачулак, што імкнуцца да гэтых галоўных артэрый, а за імі да Балтыйскага і Чорнага мораў, глыбокія і непраходныя лясы, што наяршыліся з аднаго боку ад Палесся, а з другога – ад Дзісеншчыны, спрадвеку былі і да гэтага часу застаюцца як бы натуральнымі сценамі з абодвух бакоў прасторы, на якой асела Барысаўшчына» [1, с. 126]. Прырода і гісторыя як бы сама стварыла цудоўны матэрыял для даследчыкаў мінуўшчыны. Менавіта таму Яўстафій, з самага маленства акружаны помнікамі розных вякоў і народаў, рана навучыўся сягаць думкай і сэрцам па прасторах беларускай мінуўшчыны.

З вывучэння барысаўскіх і лагойскіх старажытнасцей і пачалі Тышкевічы сваю навукова-археалагічную і краязнаўчую дзейнасць. Падчас раскопак высвятлілася, што ім не хапае спецыяльных ведаў, якія тычыліся класіфікацыі і датавання здабытых артэфактаў, вызначэння іх культурнай прыналежнасці і храналогіі. Недастаткова было ведаў і па стратыграфіі. З мэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тай авалодання навуковымі метадамі археалагічных і гістарычных даследаванняў Яўстафій едзе ў Заходнюю Еўропу, Данію, Фінляндыю і Швецыю. Няўрымслівасць Яўстафія метка падкрэсліў Каратынскі: «…юнак вяльможнага і заможнага дому, за рэдкім у гэтых сферах прыкладам, кінуўся да самастойнага папаўнення ведаў і, можна сказаць, уласнымі рукамі назапасіў вялікія скарбы гістарычнай навукі» [1, с. 127]. Акрамя спасціжэння археалогіі як навукі Тышкевіч глыбока вывучаў гісторыю і культуру шэрагу еўрапейскіх краін. Вынікам яго «замежнай стажыроўкі» стаў двухтомнік «Лісты пра Швецыю», вартасцю дадзенага выдання было не толькі вобразнае апавяданне і гарачае аўтарскае пачуццё, але і навуковы погляд на тагачасны стан Швецыі і культуру яе народа ў параўнанні з беларускай, літоўскай, польскай, звесткі пра багацце дагістарычных шведскіх помнікаў. Гарачы патрыёт сваёй Радзімы імкнуўся даведацца, што ў выніку шматлікіх войнаў вывезлі з ВКЛ шведскія заваёўнікі. З гэтай мэтай Я. Тышкевіч «ганяўся за скарбамі радзімы па шведскіх гарах і лагчынах і склаў каштоўны каталог» [1, с. 130] вывезеных помнікаў гісторыі і культуры. «Лісты пра Швецыю» адкрылі айчынным даследчыкам невычэрпную крыніцу невядомых ім артэфактаў. Дадзенай працай многія дзесяцігоддзі пасля яе выдання карысталіся не толькі гісторыкі, але і спецыялісты ў іншых навуковых галінах.

Узброены прафесійнымі ведамі, Я. Тышкевіч разам з Канстанцінам з галавой акунуўся ў карпатлівыя пошукі артэфактаў культуры, з дапамогай якіх навукоўцы імкнуліся ўзнавіць гісторыю Барысаўшчыны і свайго народа. Даследаваць чароўнасць старажытнай мінуўшчыны археолаг пачынае з ваколіц Лагойска, а потым пашырае на ўсю паўночную частку Барысаўскага павета. За аснову археалагічных даследаванняў ён узяў метад дацкага археолага К. Томсена, які падзяляў старажытнасць на тры вякі: каменны, бронзавы і жалезны. Такі падыход да перыядызацыі старажытнай культуры Я. Тышкевіч выкарыстоўваў пры сістэматызацыі археалагічных знаходак у Лагойскім музеі. Васьмігадовыя пошукі (1835–1842) і іх вынікі сталі асновай работы «Беглы агляд крыніц краёвай археалогіі ці апісанне некаторых помнікаў старажытнасці, адкрытых у заходніх губернях царства Расійскага» (1842) [4]. Гэта была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бадай першая сістэматызаваная праца айчыннай дагістарычнай археалогіі, якая ахоплівала ўсе прадметы дагістарычнай старажытнасці: курганы, жаночыя ўпрыгожанні, металічную зброю, каменныя малаткі, манеты, ідалы і іншыя прадметы, якія складаюць археалагічныя знаходкі, а таму для незнаёмых з археалогіяй і шматлікіх пад той час аматараў магла быць добрасумленным даведнікам. Адметнасцю выдання былі і шматлікія якасныя літаграфіі, зробленыя прафесіянальным мастаком Я. Азямблоўскім.

Навукова-даследчая дзейнасць Я. Тышкевіча не спынялася нават, калі граф стаў маршалкам шляхты Барысаўскага павета. Не зважаючы на графскі тытул, Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы, а часам і іх бацька Пій Фларыянавіч, нягледзячы на свой узрост, бралі ў рукі рыдлёўкі і з дапамогай навакольных сялян раскопвалі старажытныя курганы. Пераапрануўшыся ў простае сялянскае адзенне, яны хадзілі па вясковых хатах, каб паслухаць і запісаць народныя песні, легенды, паданні, шчырую гутарку сялян пра побыт, паўдзельнічаць у абрадах. Захопленыя загадкамі старажытнасці, Тышкевічы вырашылі грунтоўна разабрацца ў тыпах гістарычных помнікаў на роднай зямлі і высветліць, ці ёсць у іх заканамернасць і сувязь з культурай плямён, што некалі жылі на тэрыторыі Беларусі.

У выніку даследаванняў мноства крывіцкіх курганоў і аналізу іх пахавальнага інвентару яны першымі адзначылі этнічныя прыметы – скроневыя кольцы ў жанчын. Тым самым далі ключ для вызначэння тэрыторыі рассялення крывічоў. Аналіз пахавальнага інвентару дазволіў зрабіць ім наступныя высновы: пра гандлёвыя сувязі крывічоў з аддаленымі землямі; пра мясцовае насельніцтва, якое забяспечвала жалезам не толькі сябе, але і вывозіла яго; пра мясцовыя прылады працы і вырабы, што былі на ўзроўні тагачасных вырабаў суседніх краін. А з гэтага вынікала: у часы так званай ваеннай дэмакратыі тут не было таго варварства, пра якое сцвярджалі некаторыя гісторыкі [3, с. 86].

Пад навуковым кіраўніцтвам маршалка Я. Тышкевіча былі сабраны разнастайныя статыстычныя звесткі пра тагачаснае сацыяльна-эканамічнае жыццё жыхароў Барысаўшчыны, якія паслужылі матэрыялам для яшчэ адной важнай працы «Апісан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не Барысаўскага павета пад статыстычным, геаграфічным, гістарычным, гаспадарчым, прамыслова-гандлёвым і медыцынскім пунктах гледжання, з дадаткам звестак аб звычаях, спевах, прымаўках, народных уборах, чараўніцтве, забабонах…» (1847) [5]. Вялікай каштоўнасцю фундаментальнай працы з'яўляецца фалькларыстычны раздзел. Яго вартасць падкрэсліў В. Каратынскі: «…збор народных песень і прымавак з'яўляецца вельмі каштоўным на той час, калі ні Чачот, які збіраў песні над Нёманам, ні іншыя, хто круціўся над Прыпяццю, Віліяй і Святою, не заглядвалі ў той бок, да Бярэзіны» [1, с. 132]. Паэт з сумам адзначаў, што Я. Тышкевіч быў адзіным маршалкам, які займаўся даследаваннем фальклору, і шкадуе, што іншыя кіраўнікі шляхты не падтрымалі пачын графа. Тры чвэрці ўсёй кнігі займаюць апісанні курганоў, замчышчаў, гістарычныя ўспаміны, этнаграфічныя працы.

На аснове ўласных калекцый Тышкевічы стварылі першы на тэрыторыі Беларусі гісторыка-археалагічны музей, які размясціўся ў іх радавым маёнтку ў Лагойску. Толькі ў нумізматычнай экспазіцыі налічвалася 1140 медалёў і манет. Сярод трох тысяч кніг, сабраных у бібліятэцы музея, было каля 500 старажытных помнікаў айчыннага кнігадрукавання. У музеі захоўваліся зброя, вырабы старадаўняй разьбы, багатая калекцыя ручнікоў, сурвэтак, абрусаў [2, с. 156, 157].

Пасля трохгадовай службы ў Барысаве Я. Тышкевіч пераязджае ў Мінск і абіраецца куратарам гімназіі і членам камісіі па зборы і публікацыі даўніх актаў і прывілеяў, што захоўваліся ў архівах горада і манастырах. Сярод разнастайных службовых абавязкаў, грамадскай дзейнасці Я. Тышкевіч не пакідаў займацца ўлюблёнай археалогіяй. У выніку з'яўляецца яшчэ адна надзвычай карысная ў навуковым плане праца «Археалагічныя даследаванні помнікаў мастацтва і рамёстваў» (1850) [6]. Азначаная праца цікавая з таго пункту гледжання, што нічога ў ёй няма запазычанага, а ўсё, што аўтар напісаў пра здабытыя артэфакты, было вынікам уласных яго адкрыццяў і высноў. У ёй вучоны знаёміць аматараў археалогіі з дасягненнямі вядомых заходнееўрапейскіх археолагаў і са шкадаваннем канстатуе, што беларуская археалогія не ўзнялася да такой ступені дасканаласці. Ускрываючы прычыны такога занядбанага становішча

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

айчыннай археалогіі, важнейшай прычынай называе адсутнасць у Беларусі навуковых таварystваў. Прыйшоўшы да такой высновы, ён вырашыў стварыць аналагічнае таварыства і публічны музей старажытнасцей у Беларусі. З гэтай мэтай у 1845 г. Тышкевічы пад выглядам выставы перавезлі ў Вільню частку экспазіцый археалагічнага музея з Лагойску, якая пасля ператварылася ў прыватны музей. Шмат часу і высілкаў спатрэбілася Я. Тышкевічу, каб у Беларусі з'явіўся першы музей, адкрыты для ўсіх жадаючых незалежна ад сацыяльнага становішча. На гэтым шляху вучонаму сустракалася шмат неадольных цяжкасцей. Акрамя таго, што трэба было назбіраць велізарную колькасць культурна-гістарычных артэфактаў, літаратуры для бібліятэкі, неабходна было пераканаць пецярбургскія і мясцовыя ўлады ў неабходнасці стварэння такога музея. Толькі ў 1853 г. удалося пераканаць тагачаснага віленскага генерал-губернатара І. Г. Бібікава ў карысці таварыства і музея краёвых старажытнасцей. Яшчэ два гады спатрэбілася, каб справу разгледзілі ў Пецярбургу і толькі вясной 1855 г. у сталіцы імперыі зацвердзілі статут Археалагічнай камісіі і музея старажытнасцей. Згодна статуту пажыццёвым старшынёю і куратарам прызначаўся Я. Тышкевіч.

З запалам узяліся Тышкевічы за справу. Яны ахвяравалі музею ўсе свае зборы, назапашаныя за дваццаць гадоў вялікай затраты часу і фінансавых сродкаў: бібліятэку (3 тыс. кніг), археалагічную калекцыю, якая ўтрымлівала 2 тыс. адзінак. За ўласны кошт Тышкевічаў ажыццяўляліся выданні музея. Музей актыўна папаўняўся экспанатамі з Мінска, Магілёва, Віцебска, Оршы, Навагрудка, Крэва, Ліды, Пінска, Браслава, Паставаў і інш. Па сведчаннях В. Каратынскага, Райнгольд Тызенгаўз падараваў арнаталагічны кабінет, А. Г. Кіркор ахвяраваў цудоўны старажытны збор і, дарэчы, падрыхтаваў каталог музея. За два гады калекцыя дасягнула 10 тыс. экспанатаў [3, с. 87]. У 1856 г. музей быў афіцыйна адкрыты. Увесь сэнс жыцця Я. Тышкевіча ў гэты час сканцэнтраваўся на музеі і археалагічнай камісіі. У хуткім часе агульнымі намаганнямі быў створаны адзіны ў Беларусі «такога роду публічны збор старажытнасцей, з якім ні зборы познаньскага Таварыства сяброў навукі, ні кракаўскага Таварыства навуковага, ні тым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

болей львоўскага сховішча Асалінскіх не маглі ісці ў параўнанне» [1, с. 136]. В. Каратынскі звяртае ўвагу на тое, што музей быў сапраўдным асяродкам духоўнага жыцця: «Дзякуючы цудоўнаму абыходжанню гаспадара людзі ў не надта свежай тужурцы і з непасрэднасцю, як ва ўласным доме, аціраліся аб людзей у выдатным парыжскім фраку, з выдатным імем ці становішчам, і ніхто гэтаму не здзіўляўся, і нікому ад гэтага не было нязручна» [1, с. 141]. Шмат высілкаў трацілася на тое, каб захаваць з такой цяжкасцю створаны музей, які тагачасныя расійскія ўлады, напалоханыя паўстаннем 1863–1864 гг., пачалі разглядаць як адзін з цэнтраў «польскай інтрыгі», дзейсны сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, таму і ставілі за мэту спыніць яго дзевяцігадовую культурна-асветніцкую дзейнасць. Пад выглядам рэарганізацыі ўлады прыпынілі дзейнасць музея, а Я. Тышкевіча прымусілі падаць у адстаўку. У хуткім часе зборы музея былі перададзены пад кіраўніцтва спецыяльнай камісіі, складзенай з настаўнікаў мясцовай гімназіі і школы рабінаў, а ў 1864 г. афіцыйна забаронены, экспазіцыя была расфарміравана і вывезена ў маскоўскія музеі.

Яўстафію Тышкевічу было балюча назіраць як знішчалі мару яго жыцця, таму ён у 1865 г. пакідае ўласны дом у Вільні і пасяляецца ў літоўскім мястэчку Біржы, у маёнтку графа Міхала Тышкевіча. Літоўскі перыяд жыцця графа Яўстафія быў не менш плённым. Ён з запалам даследаваў гістарычнае мінулае гэтага краю: раскопваў курганы, збіраў народныя паданні, песні і прымаўкі, вывучаў некранутыя старасвецкія архівы. У выніку нястомнай навукова-даследчай дзейнасці з’явіліся цалкам заснаваныя на архіўных крыніцах кнігі «Біржы, беглы пагляд на мінулае мястэчка, замка і маярата» (1869) [10], «Крыніцы да гісторыі Курляндыі і Семігаліі з часоў Кароля, польскага каралевіча» (1870) [11]. Адначасова ён працаваў над гістарычнай працай «Магілы сям’і Тышкевічаў», якую аздаблялі раскошныя літаграфіі, выкананыя мастаком Вількевічам (1873) [12].

Мала каму вядома яшчэ адна грань творчасці Яўстафія Тышкевіча. Ён займаўся літаратурнай мастацкай творчасцю. У яго спадчыне маецца шмат апавяданняў, аповесцей, нарысаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(«Пан Харошча», «Другая жонка», «Вінцэнт Марэвіч», «Дзённікі панны ўтрыманкі» і інш.). У іх Тышкевіч у манеры апавядальных нарысаў стварае партрэты рэальных тыповых пастацяў, уваскрашае мастацкімі сродкамі гістарычныя ўспаміны і народныя паданні. Творы такога роду склалі змест двух зборнікаў пад назвай «Вобразы хатняга жыцця на Літве» (1865) [9]. Праўда, даследчыкі адзначалі, што па мастацкай вартасці яны ўступалі творам лепшых майстроў прыгожага мастацтва, але іх можна было параўнаць з творамі шэрагу тагачасных пісьменнікаў. Яны былі адметны трапнасцю малюнка гістарычнай старажытнасці, вобразнымі замалёўкамі эпізодаў паўсядзённага жыцця, дакладнасцю перадачы характараў рэальных асоб.

Такім чынам, аналіз жыцця, навуковай, мастацкай дзейнасці Яўстафія Тышкевіча дазваляе нам канстатаваць, што ён быў сапраўдным патрыётам беларускай зямлі, які імкнуўся паказаць ўсяму свету існаванне адметнай, самабытнай культуры беларусаў. Перад намі паўстае чалавек з адкрытым сэрцам, шчырымі таварыскімі пачуццямі, жыццё якога было поўнасцю аддадзена навуцы. Ім зроблены важкі ўклад у станаўленне і развіццё айчыннай археалогіі, музеялогіі, рэгіянальнага краязнаўства, фальклярыстыкі, літаратуры. За сваю плённую шматгадовую працу ў галіне гісторыі, археалогіі і этнаграфіі Я. Тышкевіч быў абраны ганаровым членам Расійскай Імператарскай акадэміі навук у Пецярбургу, Каралеўскай акадэміі навук у Стакгольме, Інстытута археалогіі ў Лондане, шматлікіх навуковых айчынных і замежных археалагічных таварыстваў.

---

1. *Каратынскі, В.* Яўстафій Тышкевіч : пер. з пол. / В. Каратынскі // Творы / уклад., прад. і камент. У. Мархель ; маст. М. Купава. – Мінск, 1981. – С. 126–141.

2. Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве // Пятыя Міжнар. Тышкевіцкія чытанні, Мінск, Крэцінг, 14–15 мая 2014 г. : манагр. зб. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; Kretingos muzijus grafu Tiskevicu dvare. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 183 с. : іл, [3] л. іл.

3. *Смолік, А. І.* Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А. І. Смолік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 276 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Тышкевіч, Я.* Беглы агляд крыніц краёвай археалогіі ці апісанне некаторых помнікаў старажытнасці, адкрытых у заходніх губернях царства Расійскага / Я. Тышкевіч. – Вільня, 1842.

5. *Tyszkiewicz, Hr. Eustachy.* Opisanie powiatu Borysowskiego pod wzgledem statystycznym, gospodarczym, hremyslowo-handlowym i lekarskim: z dod wiadom: o obyczajach, spiewach, przyslowiach i uborach ludu, guslach, zabobonach i t. d. / E. Tyszkiewicz. – Wilno : Drukarnia Ant. Marcinowskiego, 1847. – 489, IV s.

6. *Тышкевіч, Я.* Археалагічныя даследаванні помнікаў мастацтва і рамёстваў / Я. Тышкевіч. – Вільня, 1850.

7. *Tyszkiewicz, K.* Wiadomosc historyczna o zamkach, horodyszczach i okopiskach starozytnych na Litwie i Rusi Lietewskiej / K. Tyszkiewicz. – Wilno, 1859.

*8.* O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej / stadium archeok. przez Konstantego hrebaiego Tyszkiewicza, czlonka wielu uczonych t-w. – Berlin : [s. n.], 1868. – 287 s. : 16 tab. курганах в Литве и Западной Руси / К. Тышкевич. – Вильня, 1865.

9. *Тышкевіч, Я.* Вобразы хатняга жыцця на Літве / Я. Тышкевіч. – Варшава, 1865.

10. *Тышкевіч, Я.* Біржы, беглы пагляд на мінулае мястэчка, замка і маярата / Я. Тышкевіч. – Пецярбург, 1869.

11. *Тышкевіч, Я.* Крыніцы да гісторыі Курляндыі і Семігаліі з часоў Кароля, польскага каралевіча / Я. Тышкевіч. – Кракаў, 1870.

12. *Тышкевіч, Я.* Магілы сям'і Тышкевічаў / Я. Тышкевіч. – Варшава, 1873.

13. *Tyszkiewicz, Hr. Konstanty.* Wilija i jej brzegi / Hr. Konstanty Tyszkiewicz. – Vilnius : Liedykla Atkula, 2008. – 362 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. А. БАЛЯБИН

## ВОЙНА 1812 г. В КНИГЕ Е. П. ТЫШКЕВИЧА «ОПИСАНИЕ БОРИСОВСКОГО УЕЗДА»

Об этой книге известно многим, но читали ее далеко не все. Именно так можно охарактеризовать «Описание Борисовского уезда» известного историка, археолога, этнографа и краеведа Евстафия Пиевича Тышкевича (1814–1873) [9]. Труд, изданный в 1847 г., стал на долгие годы одним из наиболее авторитетных